ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ СІСТЭМА ДЗЯРЖАЎНЫХ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК Г. МІНСКА
ІНФАРМАЦЫЙНА–БІБЛІЯГРАФІЧНЫ АДДЗЕЛ

*Год малой радзімы*

# *Абіцель веры і святла*

***Выпуск 9***

***Паважаныя сябры! З нагоды аб'яўленага ў Беларусі Года малой радзімы прапануем вам серыю інфармацыйных выданняў «Так пачынаецца Айчына», якая будзе знаёміць вас з літаратурай, якую можна знайсці ў фондах Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк г. Мінска. Дзевяты выпуск серыі прысвечаны 500-годдзю Жыровіцкага манастыра і 550-годдзю Жыровіцкага абраза Маці Божай.***



Жыровіцкі Успенскі манастыр — мужчынскі праваслаўны манастыр у вёсцы Жыровічы Слонімскага раёна. Уладальнік вёскі падскарбі ВКЛ А. Солтан на месцы з'яўлення Жыровіцкага абраза Маці Божай пабудаваў драўляную царкву, каля 1560 адзін з яго нашчадкаў заклаў каменны храм, які не быў узведзены. У 1587 упершыню згадваецца як мужчынскі манастыр. Пры манастыры існавала школа іканапісу і гімназія, потым Літоўская духоўная семінарыя. У 1839 манастыр і семінарыя сталі праваслаўнымі. Манастыр меў багатую бібліятэку (збіралася з канца 15 ст.) з рэдкімі рукапісамі, у іх ліку Жыровіцкае евангелле, і архіў. З 1989 тут знаходзілася Мінская вышэйшая праваслаўная духоўная семінарыя, ў 1996 на яе базе адкрыта Мінская духоўная акадэмія. Архітэктурны ансамбль манастыра ўключае Успенскі сабор, Яўленскую і Крыжаўзвіжанскую цэрквы, званіцу, будынкі старой і новай семінарый, жылы корпус, трапезную, шпіталь, шэраг гаспадарчых пабудоў, пладовы сад, агарод, сажалкі. Манастыр унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

У манастыры знаходзіцца адна з галоўных хрысціянскіх святынь Беларусі — Жыровіцкі абраз Маці Божай, які ўшаноўваецца праваслаўнай і грэка-каталіцкай цэрквамі як цудатворны. Рэльефная выява на маленькім авальным яшмавым камені вось ужо больш за пяць стагоддзяў збірае да Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра шматлікіх паломнікаў не толькі з розных куткоў Беларусі, але і з суседніх краін.

Гісторыя абраза здаўна прываблівае сваімі таямніцамі даследчыкаў. З'яўленне яго ўпершыню было апісана жыровіцкім іераманахам Феадосіем Баравіком у 1622 г. Згодна з яго рукапісным творам «Гісторыя, або Аповесць, пра абраз Дзевы Марыі Жыровіцкай», святыня была знойдзена каля Жыровіч (зараз вёска ў Слонімскім раёне Гродзенскай

вобласці) пастухамі, якія пасвілі статак уладальніка мястэчка, падскарбія надворнага Вялікага Княства Літоўскага А. Салтана. Яны ўбачылі незвычайнае ззянне на грушыдзічцы ў лесе, якое даваў маленькі каменны абраз з выявай Божай Маці з дзіцем на правай руцэ. Знаходку аднеслі гаспадару, які паклаў яе ў куфэрак. Аднак адтуль абраз дзіўным чынам знік, а на наступны дзень быў зноў знойдзены на тым жа дрэве ў лесе. Апісаныя падзеі, па меркаванні аўтара, адбыліся недзе ў другой палове XV ст. Згодна з больш познімі даследаваннямі, гэта магло здарыцца ў 1493—1495 гг., аднак афіцыйна прынятай датай з’яўлення абраза быў выбраны 1470 г.

Уладальнік Жыровіч вырашыў пабудаваць на месцы з'яўлення абраза храм у гонар Прасвятой Багародзіцы і змясціў там знойдзеную выяву, аздобіўшы яе каштоўнай рызай. Вестка аб з'яўленні абраза разнеслася па наваколлі. Мноства багамольцаў сталі прыходзіць да яго, каб пакланіцца. У 1520 г. драўляная царква згарэла, аднак маленькі абразок, які ад нагрэву набыў цёмна-чырвонае адценне, зноў дзіўным чынам адшукалі на камені ля пажарышча. Згодна з легендай, яго пакінула там незвычайнай прыгажосці незнаёмка якая малілася побач. З цягам часу храм быў адноўлены, а недалёка ўзнік кляштар.

Ужо з канца XVI ст. Жыровіцкі абраз Маці Божай стаў адной з найбольш шанаваных святынь Рэчы Паспалітай і набыў славу шматлікімі цудоўнымі вылячэннямі. З жыровіцкай святыні шматразова рабіліся жывапісныя копіі на дошках, палатне і інш. Найбольш вядомай з іх з’яўляецца гравюра Л. Тарасевіча (1682) па малюнку П. Бацэвіча.

Зараз цудатворны абраз захоўваецца на месцы свайго першапачатковага з’яўлення, у Свята-Успенскім саборы ў Жыровічах. Яго свята адзначаецца штогод 20 мая, калі да яго на пакланенне прыходзяць тысячы паломнікаў. Абраз выносіцца з храма і хростным ходам абносіцца вакол пасялення. Жыровіцкі абраз Маці Божай уваходзіць у спіс 100 найбольш значных праваслаўных абразоў свету.

**Жировичская икона Божьей Матери** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. — Минск, 2006. — Т. 3. — С. 549.

**Жировичский Успенский монастырь** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. — Минск, 2006. — Т. 3. — С. 550—551.

**Жыровіцкі абраз Маці Божай** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. — Мінск, 1998. — Т. 6. — С. 470—471.

**Жыровіцкі абраз Маці Божай** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. — Мінск, 2012. — Т. 3. — С. 667—668.



**Жыровіцкі Успенскі манастыр** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. — Мінск, 1998. — Т. 6. — С. 471—472.

**Жыровіцкі Успенскі манастыр //** Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. — Мінск, 2012. — Т. 3. — С. 667.

**Жировичи**. Свято-Успенский монастырь : документальные фильмы. — Минск : Информационное агентство Белорусской православной церкви, [2013?]. — (Святыни Беларуси).

**Жировичи**. Слоним. Сынковичи : [путеводитель / текст А. Варавва]. — Минск : РИФТУР, 2004. — 1 л.(слож. в 12 с.). — (Пеший маршрут).



**Жыровіцкі** Свята-Успенскі манастыр : [альбом / аўтар тэксту А. А. Ярашэвіч]. — Мінск : Беларусь, 2006. — [46] л.

**История** Жировицкого Свято-Успенского монастыря : по письменным источникам, преданиям и свидетельствам современников / [составитель игумения Гавриила (Глухова)]. — Москва : [б. и.], 2006. — 165, [2] с., [8] л. ил.

**Здесь** мы дышим воздухом вечности... : документальный фильм о Свято-Успенском Жировичском монастыре. — Минск : Информационное агентство Белорусской Православной Церкви, [2009].

**История** Жировицкого Свято-Успенского монастыря [Звукозапись] : по письменным источникам, преданиям и свидетельствам современиков : на 3 кассетах. — Минск : Звукотэкс, 2007.

**Александрович, А.** Жировичи — духовное сердце, оплот православной веры Беларуси / Анна Александрович // Гаспадыня. — 2020. — № 5. — С. 34—35.

**Писарев, В.** В Жировичи за благодатью / Владимир Писарев // Вечерний Минск. — 2020. — 16 апр. — С. 12—13.

**Маркина, Т.** Ответ на любовь и жертву / Тамара Маркина // 7 дней. — 2020. — 19 марта. — С. 6—7.

*О праздновании 550-летия Жировичской иконы Божьей Матери и* 500-*летия* со *дня основания Свято-Успенского Жировичского монастыря.*

**Чаровская, К.** Жировичи обретают новый облик / Катерина Чаровская // СБ. Беларусь сегодня. — 2020. — 10 марта. — С. 12.

**Асіноўскі, С. М.** Там, дзе струменяць святыя крыніцы... / Святаслаў Асіноўскі // Архівы і справаводства = Архивы и делопроизводство. — 2020. — № 2. — С. 154—163.

*З гісторыі Жыровіцкага манастыра.*

**Кузьміч, М.** Абіцель веры і свята / Марына Кузьміч // Народная газета. — 2020. — 14 лют. — С. 18—19.

**Рудак, А.** Абапіраючыся не толькі на архівы / Антон Рудак // Культура. — 2020. — 8 лют. — С. 5.

*Гісторыя і сучаснасць Жыровіцкай святыні.*

**Чаровская, К.** Обитель открывает тайны / Катерина Чаровская // СБ. Беларусь сегодня. — 2019. — 4 дек. — С. 13.

*В музее Минской духовной семинарии можно узнать много интересных фактов из истории Жировичского монастыря.*

**Хорошевич, Е.** Жировичские источники / Елена Хорошевич, Анатолий Шарков // Родная прырода. — 2017. — № 6. — С. 46—47.



**Флікоп, Г.** Іканастас Успенскага сабора ў Жыровічах: новыя звесткі па пытанні атрыбуцыі / Галіна Флікоп-Світа // Беларускі гістарычны часопіс. — 2017. — № 2. — С. 14—24.

**Боянков, П.** Жировичи : летопись пяти веков / Павел Боянков // Новая Немига литературная. — 2016. — № 6. — С. 140—152.

*****

**Жировичская икона Божией Матери // Свято-Успенский Жировичский монастырь** [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://zhirovichi-monastery.by/zhirovichi_icon. — Дата доступу: 17.05.2020.

**Жыровіцкі абраз Маці Божай //** Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу:https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%90%D0%B1%D1%80%D0%B0%D0%B7_%D0%9C%D0%B0%D1%86%D1%96_%D0%91%D0%BE%D0%B6%D0%B0%D0%B9_%D0%96%D1%8B%D1%80%D0%BE%D0%B2%D1%96%D1%86%D0%BA%D0%B0%D0%B9. — Дата доступу: 15.05.2020.

**Жыровіцкі Свята-Успенскі манастыр //** Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу:https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%96%D1%8B%D1%80%D0%BE%D0%B2%D1%96%D1%86%D0%BA%D1%96_%D0%BC%D0%B0%D0%BD%D0%B0%D1%81%D1%82%D1%8B%D1%80 . — Дата доступу: 15.05.2020.

**Свято-Успенский Жировичский монастырь** [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://zhirovichi-monastery.by/ . — Дата доступа: 18.05.2020.

*****

**550 гадоў з часу з'яўлення (1470) Жыровіцкага абраза Маці Божай** : бібліяграфічны спіс / складальнікі: В. Я. Асаёнак, Т. І. Лагош, Н. А. Шашэнька ; рэдактар К. Д. Варанько // Новыя кнігі: па старонках беларускага друку. Даты беларускага календара (сакавік — красавік). — 2020. — № 1. — С. 3—5.